Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(49), 2008

*УДК 94 (476) "1921/1939"*

# Спецыфіка становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

А. М. Вабішчэвіч

Хоць заходнебеларуская праблематыка ў айчыннай гістарычнай навуцы з'яўляецца традыцыйнай на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, аднак становішча палякаў асобна не разглядалася. Існуючыя грамадскія стэрэатыпы адносна гэтай этнічнай супольнасці нярэдка знаходзілі адлюстраванне і ў працах гісторыкаў. Менавіта таму гэты тэматычны накірунак уяўляецца актуальным і запатрабаваным для ажыццяўлення перспектыўных навуковых распрацовак. Улічваючы гэта, аўтар палічыў патрэбным прааналізаваць стан палякаў у заходнебеларускіх землях у 20–30-я гг. XX ст. Для дасягнення гэтай мэты былі пастаўлены наступныя задачы: вызначыць рэальную прысутнасць палякаў у этнадэмаграфічнай структуры; адлюстраваць іх ролю і месца ў галоўных сферах жыцця тагачаснага заходнебеларускага грамадства; канкрэтызаваць характар узаемаадносін польскай супольнасці з асобнымі этнічнымі, сацыяльнымі інстытутамі; прасачыць асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі адносна розных сацыяльных груп польскага насельніцтва.

Да цяперашняга часу ў беларускай і польскай гістарычнай навуцы існуюць розныя метадалагічныя падыходы пры вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 1921 г., на тэрыторыі 24 заходнебеларускіх паветаў (акрамя часткі Віленшчыны, якая ўваходзіла ў склад Сярэдняй Літвы) колькасць польскага насельніцтва складала 1 млн. 308,6 тыс. чалавек (49,1 %), беларусаў – адпаведна 1 млн. 56,5 тыс. (39,7 %), яўрэяў – 253,8 тыс. (9,5 %), рускіх – 11,3 тыс. (0,4 %) [1, с. 34]. Аднак рэальны стан польскай прысутнасці ў заходнебеларускіх землях не адпавядаў афіцыйным вынікам перапісу насельніцтва. Мясцовыя адміністрацыйныя ўлады добра разумелі, што для павелічэння колькасці палякаў у іх склад залічвалася значная частка беларусаў-католікаў, польскамоўных жыхароў, што выкарыстоўваліся разнастайныя сродкі фальсіфікацыі вынікаў перапісу. Напрыклад, у адной са справаздач за студзень 1926 г. адзначалася, што гарадское і вясковае насельніцтва Лідскага павета, якое мела нізкі адукацыйны ўзровень і нічым не адрознівалася ад праваслаўных, прызнавала сябе палякамі, заяўляла аб лаяльных адносінах да Польскай дзяржавы [2, арк. 31].

Яшчэ ў 1920-я гг. вучоныя імкнуліся ўдакладніць афіцыйныя статыстычныя матэрыялы. Паводле беларускага даследчыка Р. Паўстынскага, у 1925 г. у Беластоцкім ваяводстве ў гарадах і мястэчках палякі складалі 39,6 % (у вёсках – 4,2 %), Віленскай адміністрацыйнай акрузе – адпаведна 47,2 % і 6,7 %, Навагрудскім ваяводстве – 25,8 % і 4,6 %, Палескім ваяводстве – 14,9 % і 1,2 % [3, арк. 73–74]. Польскія вучоныя міжваеннага часу ў сваіх працах кваліфікавалі большую частку вернікаў рымска-каталіцкага веравызнання ў якасці польскай этнічнай супольнасці. Паводле падлікаў А. Крысінскага, па стану на 1 студзеня 1928 г. палякі складалі большасць толькі ў Віленскім ваяводстве (54,2 %). У іншых рэгіёнах іх доля ў насельніцтве прызнавалася меншай: у Навагрудскім ваяводстве – 37,2 %, Беластоцкім ваяводстве (на тэрыторыі 2-х паветаў – Гродзенскага і Ваўкавыскага) – 39,3 %, Палескім ваяводстве – 11,7 % [4, с. 61–62].

Галоўным напрамкам узмацнення польскага ўплыву з'яўлялася мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка паланізацыі і нацыянальна-культурнай асіміляцыі мясцовага (пераважна беларускага) насельніцтва. Такая нацыянальная палітыка не спрыяла складванню ў свядомасці беларусаў станоўчага вобраза палякаў. Негатыўны стэрэатып "белапаляка", "ляха-пана" складваўся таксама пад уздзеяннем іншых дзейсных фактараў, у тым ліку перыядычнага друку [5].

Тэндэнцыя да наўмыснага павелічэння колькасці польскага насельніцтва яскрава праявілася ў ходзе правядзення перапісу 1931 г. Палякі пераважалі ў Шчучынскім (83,5 %), Ашмянскім (81,3 %), Лідскім (79,3 %), Валожынскім (66,5 %), Браслаўскім (65,6 %) паветах. Гродзенскі і Ваўкавыскі паветы мелі польска-беларускі характар [6, с. 68]. У якасці крытэрыя этнічнай прыналежнасці выкарыстоўваліся родная мова і веравызнанне. Польская мова ў якасці роднай адзначана ў 58,5 % жыхароў 6 паветаў Віленскага ваяводства – Браслаўскага, Дзісенскага, Маладзечанскага, Ашмянскага, Пастаўскага, Вілейскага паветаў. У Навагрудскім ваяводстве польская мова заяўлена ў 52,4 %, у Палескім – толькі ў 15,2 % жыхароў. Агульная колькасць польскамоўных у 24 заходнебеларускіх паветах ацэньвалася ў 1 млн. 893,3 тыс. чалавек (46,1 %) [1, с. 42]. Як сведчаць справаздачы асобных павятовых камендатур дзяржпаліцыі, да палякаў залічвалі асоб каталіцкага і праваслаўнага веравызнання, якія размаўлялі па-беларуску, валодалі польскай мовай, але лічылі сябе тутэйшымі.

Параўнальны аналіз вынікаў перапісу 1921 і 1931 гг., які быў зроблены ў сярэдзіне 1935 г. супрацоўнікамі палітычнага дэпартамента МУС Польшчы, засведчыў змяншэнне долі палякаў сярод насельніцтва 36 паветаў "усходніх крэсаў", асабліва ў Палескім ваяводстве. У прыватнасці, у Кобрынскім павеце гэтае змяншэнне складала 46,5 %, а ў Пружанскім – 27,2 % [7, арк. 7]. Прызнавалася, што ў большасці паветаў Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў у той ці іншай ступені частка польскага насельніцтва перайшла ў беларускую этнічную групу [7, арк. 40]. Асабліва малой была польская прысутнасць у Палескім ваяводстве – 14,5 % (паводле іншых звестак – 14,8 % [8, арк. 1]). Хоць у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах палякі мелі большасць, аднак гэта дасягалася за кошт каталіцкага насельніцтва, якое прызнавала сябе палякамі, але ў побыце карысталася беларускай мовай [7, арк. 24–25]. Праведзены пазней мясцовай адміністрацыяй аналагічны параўнальны аналіз вынікаў перапісаў на тэрыторыі Віленскага ваяводства высветліў павелічэнне колькасці палякаў у Ашмянскім, Свянцянскім, Вілейскім, Віленска-Трокскім паветах, Вільні. Змяншэнне польскай прысутнасці адзначалася ў Браслаўскім, Дзісенскім, Пастаўскім паветах [9, арк. 3].

Доля палякаў у насельніцтве Віленскага, Навагрудскага, Палескага ваяводстваў у 1931 г. у беларускай савецкай і сучаснай беларускай гістарычнай навуцы ацэньваецца прыкладна ў 12–13 % (больш 400 тыс. чалавек) [10, с. 30; 11, с. 221]. Толькі ў асобных працах апошняга часу зроблены спробы ўдакладнення польскай прысутнасці ў заходнебеларускім краі. Аналіз этнапалітычных працэсаў дазволіў В. Рабышка зрабіць высновы аб тым, што ў 1921 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі палякі складалі 31,2 % (1 млн. 23,8 тыс. чалавек), беларусы адпаведна 55,7 % (1 млн. 826,4 тыс. чалавек), яўрэі – 10,8 % (359,2 тыс. чалавек), рускія – 0,3 % (12 тыс. чалавек). Доля беларусаў у 1931 г. ёй вызначана ў 52,8 % [12, с. 17, 18]. Змены ў нацыянальнай структуры насельніцтва адбываліся пад уплывам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў [12, с. 4–5]. Толькі ў асобных працах у духу "крэсова-патрыятычнай" польскай публіцыстыкі міжваеннага часу не падвяргаюцца сумненню дакладнасць і верагоднасць перапісаў насельніцтва 1921 і 1931 гг. [13, с. 178, 180–183].

У большасці сучасных польскіх выданняў прызнаецца сфальсіфікаваны і тэндэнцыйны характар перапісаў насельніцтва 1921 і 1931 гг., выкарыстанне недакладнасцей статыстычных звестак у інтарэсах урадавых колаў Польшчы. Па самых завышаных ацэнках у 1921 г. колькасць мясцовых ("крэсовых") палякаў на тэрыторыі 24 заходнебеларускіх паветаў (акрамя Сярэдняй Літвы) ацэньваецца прыкладна ў 600 тыс. чалавек (45,8 % ад агульнай колькасці насельніцтва) [14, с. 59, 61–62; 1, с. 38]. Нягледзячы на наватарскія падыходы П. Эберхардта ў вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва, яго методыка не з'яўляецца бясспрэчнай і дасканалай. Усіх польскамоўных католікаў ён лічыць палякамі, хаця адначасова падвяргае гэта сумненню, прызнаючы існаванне католікаў-беларусаў [15, с. 49]. У П. Эберхардта няма адзінага падыходу ў этнічным вызначэнні палякаў. Для часткі Віленшчыны, якая ўвайшла пасля 1939–1940 гг. у склад Літвы (тэрыторыя Віленска-Трокскага, Свянцянскага паветаў, Вільні), выкарыстаны моўны крытэрый (колькасць палякаў там вызначана ім у 377,5 тыс. чалавек (69,1 %) [15, с. 51]. Выкарыстоўваючы крытэрый веравызнання, на астатняй тэрыторыі Заходняй Беларусі П. Эберхардт налічыў яшчэ 973,5 тыс. палякаў. Паводле яго падлікаў, у 1931 г. з 3 млн. 754,6 тыс. жыхароў Заходняй Беларусі палякаў было 36 % (1 млн. 351 тыс.

чалавек), беларусаў – 47,6 % (1 млн. 787,8 тыс. чалавек), яўрэяў – 9,4 % (352,7 тыс. чалавек), рускіх – 2,4 % (90,1 тыс. чалавек), літоўцаў – 2 % (76 тыс. чалавек), украінцаў – 1,2 % (49,5 тыс. чалавек), прадстаўнікоў іншых этнасаў – 1,4 % (52 тыс. чалавек) [15, с. 52].

Нягледзячы на адсутнасць у палякаў пераважнай большасці ў нацыянальным складзе насельніцтва, яны займалі прывілеяванае становішча ў сацыяльнай структуры. Менавіта асобы польскай этнічнай прыналежнасці складалі абсалютную большасць паліцэйска-адміністрацыйнага апарату. У 1932 г. з 5120 чыноўнікаў мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі і служачых органаў самакіравання Палескага ваяводства палякі складалі 88 %, рускія – 5,8 %, беларусы – 3,6 %, яўрэі і ўкраінцы – па 1,3 % [16, арк. 28]. Панаванне палякаў сярод чыноўніцкіх кадраў назіралася і ў іншых ваяводствах. У 1930-я гг. узмацнялася тэндэнцыя поўнага выдалення няпольскіх прадстаўнікоў з дзяржаўнага апарату. Значная частка чыноўнікаў была прыслана з іншых рэгіёнаў Польшчы, не ведала мясцовых традыцый, мовы, нярэдка праяўляла да іх пагардлівыя адносіны.

Акрамя чыноўнікаў, у гарадах жылі таксама прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі, нешматлікія купцы, рамеснікі, рабочыя. Малалікая польская інтэлігенцыя не магла ўключыцца ў актыўную грамадскую працу. Выхаванне кадраў інтэлігенцыі, польскай па поглядах і культуры, з мясцовага насельніцтва, мела першачарговае значэнне для паспяховай паланізацыі "крэсаў" [17, с. 84]. Нават у такіх абставінах за палякамі было забяспечана пануючае становішча. Так, нацыянальны склад інтэлігенцыі Палескага ваяводства (па стану на 15 лютага 1932 г.) быў наступным – палякі складалі 75,5 %, яўрэі – 9,8 %, рускія – 9,5 %, украінцы і беларусы – па 2,5 % [16, арк. 23]. Для польскіх улад важнае значэнне набывала паланізацыя і акаталічванне гарадоў, пераўтварэнне іх у моцныя ачагі пашырэння польскай культуры, асветы.

У сацыяльнай структуры надзейнай апорай польскіх урадаў лічыліся памешчыкі. Менавіта таму ў параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі ваяводствамі Польшчы замест 180 га норма землеўладання ў заходнебеларускіх землях павышалася да 400 га, а пры наяўнасці прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі – да 1000 га [18, с. 26]. Інтарэсы польскіх землеўладальнікаў патрабавалі сацыяльна-эканамічнага ўмацавання памешчыцкіх гаспадарак. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., у Заходняй Беларусі сярод буйных землеўладальнікаў дамінавалі палякі – ім належала 84,4 % гаспадарак. Гэты паказчык польскай прысутнасці сярод землеўладальнікаў быў вышэйшы, чым агульнапольскі (82 %). Беларуская этнічная прыналежнасць адзначана ў 8,7 % (485) землеўладальнікаў (у межах Польскай дзяржавы гэта складала ўсяго 2,5 %). Амаль палова польскіх гаспадарак (46,4 %) – гэта землеўладанні памерам ад 50 да 100 га (сярод гэтай катэгорыі гаспадарак беларусы мелі самы высокі ўласны паказчык – 12 %, а па Палескаму ваяводству – нават 39,4 %). Агульная доля беларусаў сярод буйных землеўладальнікаў складала ў Віленскім ваяводстве – 8,2 %, Навагрудскім – 8,2 %, Палескім – 17,9 %. Прадстаўнікам іншых этнічных супольнасцей належала ў Заходняй Беларусі ў той час 6,9 % буйных гаспадарак [19, с. 25, 191]. Па плошчы буйных землеўладанняў ў Заходняй Беларусі палякі таксама складалі большасць – 78,5 %, беларусам належала 4,1 %, іншых этнічным супольнасцям – 17,4 %. Калі беларуская прысутнасць пры размеркаванні буйной зямельнай уласнасці не мела істотнай рэгіянальнай адметнасці, то польская вагалася – ад 68,3 % у Палескім ваяводстве (27,1 % належала там прадстаўнікам іншых этнічных супольнасцей, беларусам – толькі 4,6 %) да 92,3 % у Беластоцкім ваяводстве [19, с. 26]. У свядомасці пераважна незаможнага няпольскага насельніцтва польскія памешчыкі выступалі як прыгнятальнікі і прадстаўнікі пануючай нацыі. Буйныя землеўласнікі захоўвалі традыцыі былой шляхецкай арыстакратыі, адрозніваліся ад іншых сацыяльных слаёў матэрыяльнымі ўмовамі і ладам жыцця.

Дамінуючае становішча польскіх памешчыкаў захавалася і ў канцы 1930-х гг. У 1939 г. доля палякаў сярод уладальнікаў гаспадарак плошчай 50–100 га асобных паветаў Віленскага ваяводства вагалася ад 66 % у Браслаўскім павеце да 97,1 % у Пастаўскім павеце. Беларуская прысутнасць была нязначнай – ад 0,2 % у Маладзечанскім павеце да 3,6 % у Дзісенскім [9, арк. 12–13].

Пазіцыі польскага землеўладання павінны былі ўмацавацца ў ходзе ажыццяўлення вайсковага асадніцтва. Да 1923 г. ва ўсходніх ваяводствах Польшчы 7918 вайсковым каланістам былі перададзены і размеркаваны землі 785 маёнткаў агульнай плошчай 137 тыс. га (ворныя

зямлі складалі 89,5 тыс. га) [20, с. 271]. Насаджэнне вайсковага асадніцтва выклікала незадаволенасць з боку няпольскага насельніцтва. Польскія вайсковыя каланісты не змаглі змяніць нацыянальнай структуры, аднак з'яўляліся ў вачах мясцовага насельніцта сімвалічным прадстаўніцтвам польскай палітыкі. Частка польскай палітычнай эліты, ліберальнай інтэлігенцыі прызнавала негатыўныя і нават варожыя адносіны мясцовага насельніцтва да асаднікаў. Ва ўмовах росту антыпольскіх і антыдзяржаўных настрояў вайсковае асадніцтва ставілася пад сумненне, у польскага грамадства не было адзінства адносна яго мэтазгоднасці [21, с. 19–20].

У параўнанні з вайсковым асадніцтвам, цывільнае асадніцтва не насіла планавага характару. Пасля прыняцця закона аб аграрнай рэформе 28 снежня 1925 г. асаднікі страцілі ранейшыя правы, хоць і захоўвалі прывілеяванае становішча. Аднак узаемаадносіны польскіх вайсковых і цывільных каланістаў з заходнебеларускімі сялянамі заставаліся складанымі і супярэчлівымі, хоць паступова эвалюцыяніравалі ў бок паляпшэння. Напрыклад, у канцы 1920-х гг. у Баранавіцкім павеце мясцовыя беларускія сяляне ўхіляліся асаднікаў, праяўлялі да іх нянавісць, тыя ў сваю чаргу паводзілі сябе як былая шляхта [22, арк. 15]. Аднак былі і іншыя прыклады. У Шылавіцкай гміне Слонімскага павета беларускія сяляне выказвалі спагаду да асаднікаў, якія прыязджалі ў вёску прасіць бульбу, выказваючы пры гэтым негатыўныя адносіны да рэжыму "санацыі". "Хаця асаднікі ўзброены, аднак насельніцтва іх ужо не баіцца" [22, арк. 36]. Аднак паміж асаднікамі і мясцовым насельніцтвам існавалі непераадольныя нацыянальныя, культурныя, канфесійныя і грамадскія супярэчнасці.

Хоць асаднікі павінны былі спрыяць асіміляцыі беларусаў, стрымліваць антыдзяржаўныя выступленні, быць апорай мясцовай адміністрацыі, аднак польскія ўлады праяўлялі недастатковы клопат пра іх патрэбы. У 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было больш 8 тыс. асаднікаў, з іх 2630 – у Віленскім ваяводстве, 2539 – у Палескім ваяводстве, 2444 – у Навагрудскім ваяводстве [19, с. 162]. У 1937 г. ва ўсходніх ваяводствах колькасць вайсковых асаднікаў дасягнула 9–9,1 тыс. чалавек, а разам з цывільнымі – 16,6 тыс. чалавек [23, с. 102, 243]. Амаль палова з іх прыходзілася на Валынскае ваяводства (41,5 %), 21,7 % – на Навагрудскае ваяводства, 13,3 % – на Віленскае ваяводства, 12,6 % – на Палескае ваяводства [23, с. 103]. Пашырэнне асадніцтва запавольвалася аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі. Да канца 1930-х гг. асаднікі не змаглі спаўна выканаць ускладзеную на іх ідэалагічную функцыю па ўзмацненню польскага ўплыву. Як адзначала ў 1939 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне, асадніцтва не змагло ўстанавіць пастаянны і непасрэдны кантакт з мясцовымі сялянамі, не далучылася сур'ёзна да паскарэння працэсу паланізацыі Палесся [24, с. 14].

За кошт асаднікаў умацоўвалася сялянска-серадняцкае польскае землеўладанне ў Заходняй Беларусі. У параўнанні з каланістамі-палякамі зямельныя надзелы беларускіх сялян выглядалі мізэрнымі. У 1939 г. у Віленскім ваяводстве 75,9 % набытай у ходзе парцэляцыі зямлі дасталася палякам, 18,6 % – беларусам, 1,8 % – літоўцам, 0,9 % – рускім, 0,5 % – яўрэям. Сярэдні памер зямлі на 1 чалавека беларускай прыналежнасці (каля 4 га) адставаў ад памеру, які прыходзіўся для палякаў (6,8 га) [9, арк. 16]. Для прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва на Палессі і ў іншых рэгіёнах былі ўведзены наўмысныя абмежаванні і забароны на набыццё зямлі. Менавіта таму, як і ў адносінах да памешчыкаў, так і асабліва адносна асаднікаў адмоўныя сацыяльныя стэрэатыпы цесна дапаўняліся і перапляталіся з нацыянальнымі.

У адрозненне ад сельскай мясцовасці, у гарадах і мястэчках эканамічныя пазіцыі належалі яўрэям. Напрыклад, у Палескім ваяводстве ў 1939 г. у прамысловасці яўрэйскіх уласнікаў было 59,6 %, у гандлі – 70,9 %, у рамястве – 76,1 %. Польская прысутнасць там складала адпаведна 23,7 %, 16,1 % і 9,8 %. Мясцовыя палешукі мелі таксама слабыя пазіцыі – адпаведна 15,7 %, 12,7 %, 13,9 % [24, с. 56]. З 24229 аб'ектаў гарадской нерухомасці ў Палескім ваяводстве ў 1939 г. 16,3 % належала палякам, 46,2 % – яўрэям, 36,2 % – "тутэйшым" [24, с. 63]. Іншыя суадносіны былі ў Віленскім ваяводстве у 1939 г. палякі дамінавалі ў валоданні матэрыяльнымі каштоўнасцямі [9, арк. 7]. Пры гэтым ваяводскае ўпраўленне лічыла, што "ліквідацыя яўрэйскага элементу ў гарадах станоўча зменіць іх нацыянальную структуру, стварыць для палякаў новыя сферы занятасці, г. зн. пашырыць польскі ўплыў, аслабіць там сацыяльную напружанасць, паспрыяе знікненню беспрацоўя [9, арк. 52]. У цэлым, у грамадскай свядомасці няпольскага насельніцтва прывілеяваныя слаі грамадства амаль паўсюдна

атаясамліваліся з палякамі, хаця ў асобных сферах грамадскага і асабліва гаспадарчага жыцця (у прамысловасці, гандлі, рамястве, вольных прафесіях і інш.) яны былі аўтсайдэрамі і значна ўступалі яўрэям.

Змястоўныя звесткі пра становішча польскай супольнасці на тэрыторыі Палескага ваяводства змяшчае асобны мемарандум палескага ваяводы Я. Крагельскага (жнівень 1932 г.) [16, арк. 1–39]. Планавалася павялічыць долю палякаў на працягу 10 гадоў найперш за кошт "вельмі пасіўнага элементу" (мясцовага няпольскага насельніцтва) у ходзе яго істотнай паланізацыі. Толькі 3,8 % насельніцтва (гарадскія жыхары) з'яўляліся "польскім элементам добрай якасці", хаця і адарваным ад народных мас. Палова вясковых палякаў прылічана да поўнасцю пасіўнага насельніцтва. Усяго актыўнага польскага элементу налічвалася толькі 4–5 % [16, арк. 8]. Існуючае рассяленне нешматлікіх, распыленых груп каланістаў прызнавалася нерацыянальным. Новая хваля засялення асаднікамі звязвалася з ажыццяўленнем меліярацыі Палесся. Польскія памешчыкі, якія валодалі велізарнымі латыфундыямі (у Лунінецкім павеце іх уладанні складалі да 70 % лясных плошчаў; у паўночнай частцы Брэсцкага павета, Кобрынскім, Пружанскім паветах памер зямельных уладанняў вагаўся ад 100 да 500 га), слаба ўдзельнічалі ў палітычным жыцці, абмяжоўваліся адстойваннем толькі прыватнаўласніцкіх інтарэсаў. Польскія купцы і рамеснікі былі нешматлікай і слабой групай у параўнанні з яўрэйскімі гандлярамі і рамеснікамі [16, арк. 12]. Нешматлікай і распыленай групай была польская інтэлігенцыя. Слабаактыўнай прызнавалася засцянковая шляхта Пінскага, Столінскага і іншых паветаў, дзе "традыцыі польскай шляхты яшчэ не загінулі і могуць паслужыць асновай для вяртання да польскасці" [16, арк. 13]. Вайсковыя асаднікі прызнаваліся "свядомым польскім элементам", які прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, аднак з-за распыленасці, даволі малой колькасці і вельмі цяжкага матэрыяльнага становішча не адыгрываў сваёй функцыянальнай ролі [16, арк. 14].

Планы ўзмацнення польскага ўплыву актыўна распрацоўваліся мясцовай адміністрацыяй і ўрадавымі коламі ў другой палове 1930-х гг. У лютым 1937 г. палескі ваявода В. Костэк-Бернацкі ў асобным лісце ў МУС Польшчы сярод шэрагу прапаноў выказваўся за паскарэнне меліярацыйных работ, пашырэнне камасацыі, асабліва для засцянковай шляхты, паскарэнне перадачы памешчыцкіх маёнткаў дзяржаве для іх наступнай парцэляцыі [25, арк. 15]. "Палессе становіцца зручнай тэрыторыяй для гарадской каланізацыі. Сучасныя палескія гарады і мястэчкі заселены … пераважна яўрэйскім элементам і значным працэнтам рускіх і русіфікаваных палешукоў. Польскі элемент у гарадах і мястэчках – гэта амаль выключна чыноўнікі і дзяржаўныя служачыя" [25, арк. 19]. На адной з канферэнцый чыноўнікаў ваяводскіх упраўленняў і кіраўнікоў Карпусоў аховы памежжа 24 красавіка 1937 г. адзначалася, што асадніцтва не толькі не спрыяла паланізацыі, але нават яе абцяжарвала, бо гаспадаркі асаднікаў – "гэта пераважна бедныя, ўбогія і нешматлюдныя асяродкі" [26, арк. 5 адв.]. Летам 1937 г. навагрудскі ваявода прадставіў на з'ездзе павятовых стараст дакумент "Актывізацыя польскага элементу" [27, арк. 36–47], паводле якога да канца 1938 г. меркавалася паланізаваць 5780 сем'яў былых шляхецкіх засценкаў, дзе ў побыце пераважала беларуская мова.

З планамі паскарэння паланізацыі выступалі і асобныя правыя польскія партыі. На з'ездзе Лагеру нацыянальнага аб'яднання (Obozu Zjednoczenia Narodowego) 19 красавіка 1938 г. быў прапанаваны шэраг мер па ўмацаванню сярэдняга саслоўя, ролі інтэлігенцыі ва ўздыме культуры насельніцтва ўсходніх ваяводстваў [28, арк. 3–11]. Заганнай была прызнана практыка падбору адміністрацыйных кадраў з "пераважна менш каштоўнага ў прафесійнай падрыхтоўцы, грамадскіх вартасцях элементу". "Гэты прышлы элемент даволі цяжка прыжыўся ў новым асяроддзі, не навязаўшы цесных сувязей з мясцовым насельніцтвам" [28, арк. 8 адв.]. Эфектыўнасць палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ставілася ў залежнасць ад наяўнасці адпаведных кадраў польскай інтэлігенцыі. "Кожны польскі інтэлігент на гэтых землях – гэта павелічэнне нашага нацыянальнага патэнцыялу, узмацненне таго элементу, які будзе праводзіць ва ўсходніх землях грамадскую працу" [28, арк. 9].

Ход дэмаграфічных працэсаў яшчэ больш пераконваў адміністрацыйныя ўлады ў тым, што колькаснай перавагі польскага элементу можна дасягнуць толькі шляхам узмацнення працэсу асіміляцыі і паланізацыі мясцовага насельніцтва. Паводле П. Эберхардта, натураль-

ны прырост насельніцтва ў Польшчы складаў у 1932–1935 гг. 13,1 %, у 1936–1939 гг. – 11,5 % [15, с. 52]. Аднак яшчэ ў 1930-я гг. на падставе дэмаграфічных даследаванняў, статыстычных звестак рабіліся прагнозы аб змяншэнні долі польскага насельніцтва з-за падзення яго натуральнага прыросту [29, арк. 15–16 адв.]. У прыватнасці, высокія паказчыкі натуральнага прыросту назіраліся на Палессі – 19,2 % (у мясцовага насельніцтва – каля 19,4 %, у палякаў – каля 17 %, яўрэяў – каля 14 % (адчуваўся ўплыў іх эміграцыі)) [24, с. 17–18].

Аднак нельга пагадзіцца з абсалютызацыяй П. Эберхардтам стабільнасці нацыянальнай структуры, нязменнасці працэнтных суадносін розных этнасаў пасля перапісу 1931 г. Менавіта пры такіх падліках колькасць беларусаў напярэдадні Другой сусветнай вайны ацэньваецца ім у 1 млн. 963,3 тыс. (47,6 %) (гэтая лічба ўяўляецца заніжанай), палякаў – 1 млн. 484,9 тыс. (36 % мясцовага насельніцтва), яўрэяў – 387,7 тыс, рускіх – 99 тыс, літоўцаў – 82,5 тыс., украінцаў – 49,5 тыс., іншых – 57,7 тыс. [15, с. 53]. Праведзеныя яшчэ ў канцы 1930-х гг. асобныя даследаванні ставяць пад сумненне прамалінейны ход этнадэмаграфічных працэсаў у 1930-я гг. у інтэрпрэтацыі П. Эберхардта. Так, у 1937–1938 гг. С. Віславух высветліў, што ў Віленска-Трокскім і Ашмянскім паветах з пераважным каталіцкім насельніцтвам не адзначаны рост польскай нацыянальнай свядомасці. Жыхары часта атаясамлівалі сваю этнічную прыналежнасць з канфесійнай (каталікі – значыць палякі) ці дзяржаўнай (у Польшчы – значыць палякі). У вёсцы Авены гміны Гервяты з 96 чалавек 93 назвалі роднай мовай беларускую [30, с. 7]. З 52 апытаных вёсак згаданых 2-х паветаў толькі ў 7 быў адзначаны “добры ўзровень нацыянальнай свядомасці польскага насельніцтва” [30, с. 19, 57]. Задэклараваны ў ходзе перапісу насельніцтва 1931 г. польска-беларускі характар тэрыторыі паміж Вільняй і Ашмянамі ў ходзе праведзенага даследавання не пацвердзіўся. У якасці роднай мовы мясцовае каталіцкае насельніцтва называла беларускую ці “простую”. Польская мова таксама выкарыстоўвалася, асабліва моладдзю [30, с. 17–18]. Характарыстыка дэмаграфічных паказчыкаў Ваўкавыскага павета пачатку 1939 г. таксама сведчыць аб аслабленні пазіцыі палякаў у гарадах на карысць яўрэяў, у вёсках – на карысць беларусаў [31, арк. 22].

Ацэньваючы рэальную прысутнасць палякаў у этнадэмаграфічнай структуры Заходняй Беларусі, аўтар дадзенага артыкула імкнуўся прасачыць яе не столькі на падставе урадавых (афіцыйных) звестак, колькі разнастайных даследаванняў польскіх і беларускіх вучоных, не абсалютызуючы канкрэтныя пазіцыі. На наш погляд, нягледзячы на праблематычнасць у прывядзенні дакладных звестак аб колькасці палякаў, апошнія дасягненні польскіх і асабліва беларускіх даследчыкаў [12] даюць больш рэалістычную карціну і заслугоўваюць увагі, а таксама далейшага развіцця з улікам навейшых навуковых методык.

У цэлым, становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час было супярэчлівым. З аднаго боку, у межах Польскай дзяржавы яны сталі пануючым народам, атрымалі прывілеяванае становішча ў вядучых сферах грамадскага жыцця. Польскі этнас абавязваўся ажыццявіць на практыцы цывілізацыйную місію ў заходнебеларускіх землях. З другога боку, па колькасных і якасных параметрах палякі не атрымалі пераважнага становішча ў насельніцтве краю, займалі нязначныя пазіцыі ў асобных галінах гаспадаркі. Павелічэнне колькасці адбывалася не столькі праз каланізацыю, колькі шляхам правядзення мэтанакіраванай паланізацыі і асіміляцыі мясцовага няпольскага (пераважна беларускага) насельніцтва. Першапачаткова “крэсовыя” палякі мелі нізкі культурны ўзровень, аднак пры ўсямернай падтрымцы з боку дзяржаўных структур, грамадскіх інстытутаў да канца 1930-х гг. змаглі істотна ўзмацніць пазіцыі польскай культуры, але не забяспечылі яе панаванне. Азнаямленне з асноўнымі момантамі польскай праблематыкі міжваеннага часу (асабліва з заблытанай статыстыкай польскага насельніцтва) пераконвае ў неабходнасці правядзення айчыннымі вучонымі далейшых сур’ёзных даследаванняў у гэтым напрамку з выкарыстаннем разнастайных метадалагічных і метадычных падыходаў, новых масіваў крыніц.

**Abstract.** The paper analyzes the discrepant status of the Polish ethnic community in Western Belarus in the 1920–1930s. Due to a number of factors and special policy of the government the Poles acquired a privileged position in various spheres of social life, but still did not manage to dominate the national structure of the population or to provide the leading position for the Polish culture.

## Літаратура

1. Mironowicz, E. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku / E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik. – Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. – 171 s.

2. Месячныя справаздачы аб рабочым і грамадска-палітычным руху на тэрыторыі Лідскага павета ў 1926 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Ф. 200. – Воп. 2. – Спр. 8.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 242п. – Воп. 1. – Спр. 7.

4. Krysiński, A. Liczba i rozmieszczenie ludności polskiej na Kresach Wschodnich / A. Krysiński. – Warszawa: Wydawnictwa Instytuta Badań Spraw Narodowościowych, 1929. – 76 s.

5. Кротаў, А.М. Вобраз Польшчы і палякаў у беларускім перыядычным друку 1920–1929 гадоў: Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук; 07.00.03 – усеагульная гісторыя / А.М. Кротаў; БДУ. – Мінск, 1997. – 21 с.

6. Eberhardt, P. Polska ludność kresowa: Rodowód, liczebność, rozmieszczenie / P. Eberhardt. – Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1998. – 242 s.

7. Рэферат "Праблемы ўсходніх зямель у святле непасрэднага назірання за тэрыторыяй" (1935 г.) // Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespół 9/1. – Sygnatura 946.

8. Паведамленні аддзела грамадскай бяспекі Палескага ваяводскага ўпраўлення, ДОК-IX аб уплыве арганізацый ваеннай і фізічнай падрыхтоўкі на нацыянальную меншасць Палескага ваяводства (1932–1933 гг.) // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2236.

9. Агляд нацыянальнага складу, эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця насельніцтва Віленскага ваяводства ў 1939 г. // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1092.

10. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В.А. Полуян. – Минск: Наука и техника, 1978. – 359 с.

11. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2 / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш.; Рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) і інш. / АН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1995. – 560 с.

12. Рабышка, В.Э. Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах: Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук; 07.00.02 – айчынная гісторыя / В.Э. Рабышка; УА "БДПУ імя М. Танка". – Мінск, 2004. – 22 с.

13. Кручковски, Т.Т. Поляки на Беларуси на фоне истории и современности / Т.Т. Кручковски. – Слоним: ГОУПП «Слоним. тип.», 2003. – 272 с.

14. Eberhadt, P. Przemiany narodowościowe na Białorusi / P. Eberhadt. – Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1994. – 182 s.

15. Eberhardt, P. Struktura narodowościowa Polski północno-wschodniej w latach trzydziestych XX wieku / P. Eberhardt // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej (Białoruś Zachodnia i Litwa Wschodnia) w latach 1939–1941: Materiały z konferencji naukowej. – Warszawa, 24–26 listopada 1993 r./ Instytut studiów politycznych PAN; Rod red. M. Giżejewskiej i T. Strzembosza. – Warszawa: ISP PAN, 1995. – 406 s. – S. 44–56.

16. Мемарандум палескага ваяводы аб эканамічным, грамадска-палітычным, культурным, нацыянальным становішчы Палесся (1932 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253.

17. Giertych, J. O program polityki kresowej / J. Giertych. – Warszawa: Patria, 1932. – 145 s.

18. Броўкін, Я. Эканоміка Польшчы ў 1921–1929 гг. / Я. Броўкін // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 3. – С. 25–31.

19. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 201 с.

20. Kalendarz ziem wschodnich na rok 1935 / Pod red. W. Wasunga. – Warszawa: Wydawnictwo Zarządu Głównego TRZW, 1934. – 400 s.

21. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków: Gebethner i Wolff, 1924. – 56 s.

22. Справаздачы, інфармацыі і даклады ЦК КПЗБ аб дзейнасці КПЗБ … (1929–1933 гг.) // НАРБ. – Ф. 242п. – Воп. 1. – Спр. 261.

23. Stobniak-Smogoczewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920–1945 / J. Stobniak-Smogoczewska,. – Warszawa: Instytut studiów politycznych PAN, Oficyna wydawnicza RYTM, 2003. – 419 s.

24. Polski stan posiadania na Polesiu. – Brześć nad Bugiem: B. w., 1939. – 110 s.

25. Прапановы палескага ваяводы аб мерах па ўздыму адукацыйнага ўзроўню насельніцтва "ўсходніх крэсаў", рэлігіі, каланізацыі Палесся і па іншых пытаннях (25.07.1933 г. – 29.04.1938 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1656.

26. Пратаколы канферэнцыі ваявод і камандзіраў карпусоў па пытанню нацыянальнай палітыкі і рэвізіі пінскага следчага аддзела дзяржаўнай паліцыі (1932–1938 гг.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1091.

27. Месячныя справаздачы павятовых старастаў Палескага ваяводскага ўпраўлення аб дзейнасці польскіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый, рэлігійным руху, рэферат аб грамадска-палітычным і культурным жыцці насельніцтва Навагрудскага ваяводства (2.10.–21.12.1937 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1281.

28. Рэфераты аб умацаванні сярэдняга саслоўя і ролі інтэлігенцыі ва ўздыме культуры і жыццядзейнасці насельніцтва ўсходніх зямель Польшчы (20.06.1938 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1427.

29. Справаздачы павятовых старастаў аб дзейнасці грамадскіх арганізацый і каталіцкім руху з дадаткам копіі пратакола з'езда Палескага ваяводскага аддзялення Саюза вясковай моладзі (19.04.1936 г. – 2.07.1936 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1007.

30. Wysłouch, S. Polacy i białorusini-katolicy na terenie Wileńszczyzny. – Warszawa: Istytut badań spraw narodowościowych, 1938. – 61 s.

31. Рэферат беластоцкага ваяводы аб праблемах умацавання становішча і ўзмацнення ўплыву польскага насельніцтва ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ваяводства (30.01.1939 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1574.

Брестский государственный
университет им. А. С. Пушкина

Поступило 15.10.07